


У 1866 г. ім была напісана на беларускай мове камедыя (ці, як вызначаў яе жанр сам пісьменнік, фарс-вадэвіль) "Пінская шляхта". Яна лічыцца лепшым з твораў В. Дуніна-Марцінкевіча. У гэтай п'есе высмейваюцца фанабэрыя і адначасова страх перад уладамі дробнай шляхты, несправядлівы суд. Сцэнічнае ўвасабленне"Пінская шляхта" атрымала толькі ў 1917 г., пастаноўку ажыццявіла Першае беларускае таварыства драмы і камедыі ў мінскім гарадскім тэатры. А ў 1918 г. п'еса была ўпершыню апублікавана - у газеце "Вольная Беларусь". Вось ужо болей чым за 100 гадоў "Пінская шляхта" не сыходзіць са сцэны шэрага беларускіх тэатраў.

https://yandex.by/video/preview/5624062151087146415